Кніжны гасцінец

КАРУНКІ СЯМЕЙНЫХ ХРОНІК

Змітрок Бядуля. У кузні ў хохліка. Мінск, «Мастацкая літаратура», 2021.

Не кожнаму вялікаму пісьменніку дадзены дар казачніка... А вось Змітрок Бядуля ўмеў байкі баяць. Вядома, найперш успамінаецца яго казачная аповесць пра сярэбраную табакерку і сям'ю жвавых, спрытных, мілых зайчыкаў-шарачкоў. Але ў беларускага майстра стылю ёсць і кароценькія казачкі, якія якраз падыходзяць для серыі «Я люблю чытаць» выдавецтва «Мастацкая літаратура». Невялікія, але дыхтоўна афармленыя кніжачкі дапамогуць не адной сям'і карысна прабавіць вечар. «Ля рэчкі, пад вольхай, хохлік знайшоў ракавінку. Уладзіў у ёй кузню і давай чырвонцы каваць». А потым скрыні з золатам паўсюль закопвае... Ну як не пазайздросціць такому багаццю? Усе спрабуюць адабраць у хохліка яго скарбы, не задумваючыся, што здабытыя яны рупнай працай. І хлопчык Саўка туды ж — хоча тыя багацці займець, вядома ж, у купальскую ноч... Але хохлікі ўзнагароджваюць толькі тых, хто добра працуе. А хто хоча нічога не рабіць, але пнецца сарваць блінец з неба, як злая каралеўна з іншай казкі, — будзе вечна насіцца ў выглядзе хмаркі, плакаць ды закрываць ад іншых сонечнае святло. Бядуля ўмела пераўвасабляе фальклорныя матывы на свой літаратарскі лад. Прыгожыя беларускія словы, зграбная мелодыя аповеду, вечныя ісціны... Добрае папаўненне хатняй бібліятэкі дома, дзе гадуюцца дзеткі.

Марына Сцяпнова. Сад. Выдавецтва «АСТ», Масква, 2020.

Аўтар гэтага рамана — лаўрэат прэміі «Вялікая кніга», па агульным прызнанні, добры стыліст, і вось — навінка... Як не пацікавіцца? Прачыталася за адзін, як той казаў, глыток. Сапраўды — добры стыль, чытэльна, дынамічна... Але ўражанне засталося няпэўнае, як ад штучнай ікры, якая з выгляду і на смак амаль сапраўдная. І твор амаль добры. Тут і стылізацыя пад класічны рускі раман (дзеянне адбываецца ў канцы XIX ст.), і постмадэрнісцкае высмейванне той жа класікі — нездарма героі ніяк не дачытаюць «Вайну і мір». І сучасная кан'юнктурная трактоўка гістарычных персанажаў (напрыклад Аляксандра Ульянава), і «казырная» тэма дыскрымінацыі жанчын, іншаверцаў ды іншых уразлівых праслоек насельніцтва... За сюжэтнымі лініямі хочацца сачыць. У немаладых княгіні і князя Барацінскіх нараджаецца дачка Наталля (названая ў гонар Наташы Растовай), але ў свецкіх колах такія познія роды — амаль што непрыстойнасць. Князь з'язджае ў свецкае жыццё, княгіня, аматарка Льва Талстога, у разгубленасці, Тусю выхоўвае сябар сям'і, прагрэсіўны аскетычны доктар Мейзель, які замяняе ёй бацьку. Мейзель змагаецца з забабоннасцю і цямрэчай, якія ёсць і ў княжацкіх палацах. З'яўляецца паралельная лінія: княгіня Барацінская бярэ на выхаванне равесніцу Тусі, дачку сваёй памерлай швяі, Нюту. Але вялікага сяброўства паміж дзяўчаткамі не ўзнікае. Туся, вырасшы эмансіпэ, марыць разводзіць коней, атрымаць адукацыю. Яшчэ адна сюжэтная лінія датычыцца немаёмнага прыгажунчыка Віктара Радовіча, сябра Аляксандра Ульянава і сына ссыльнага шляхціца. Менавіта за Віктара нечакана выйдзе замуж Туся... Але ніводная лінія толкам не завершыцца. І ніводзін з персанажаў не будзе адназначна станоўчым, што, у прынцыпе, не ёсць заганай стылю. Мейзель — самаадданы доктар, але часам уражвае чэрствасцю, у дачыненні, напрыклад, да беднай сіраты Нюты. Разумніца Туся выглядае эгаісткай, якая прывыкла атрымліваць усё, што хоча — бязвольны Радовіч спачатку ж быў жаніхом беднай рахманай Нюты, што княжну не спыніла... Сам Радовіч выявіўся шулерам і гулякам, дый баязліваец ён адметны... Нюта, пра бацькоў і лёс якой падрабязна ў духу Дастаеўскага расказваецца, раптам раз — і знікае з тэксту... І што далей будзе з той жа Тусяй? Ясная справа, далей трэба было б распісваць доўга — Першая сусветная, рэвалюцыя... Гэта ўжо «блуканне па пакутах», а не сямейная хроніка з назвай, якая адсылае да Чэхава. Пра раман водгукі супрацьлеглыя. Што не дзівіць. Безумоўна, ён чытаецца і змушае да тыповых інтэлігенцкіх рэфлексій. Няўжо ўсе выхаваўчыя высілкі — і ў адносінах да дзіцяці, і ў адносінах да народа — дарэмныя, і з чалавека атрымліваецца тое, што ён ёсць? «Ёй наогул было ўсё роўна — у самым страшным, самым рускім сэнсе гэтага няхітрага выразу. То-бок сапраўды: усё — роўна. Абы вайны не было ды лета ўрадзілася. І на каменнае гэта, безнадзейнае «ўсё роўна» немагчыма было паўплываць ніякімі рэвалюцыямі, рэформамі або маральнымі намаганнямі добрых і сумленных людзей, якія стагоддзе за стагоддзем адчувалі сябе вінаватымі толькі таму, што ўмелі думаць і пакутаваць адразу на некалькіх мовах ды штодня дачыста мылі шыю і рукі».

Дарэчы, сад у фінале па загадзе Тусі ссякаюць (зноў з відавочнай адсылкай да Чэхава), бо Тусі патрэбныя лугі, каб пасвіць коней, якіх яна збіраецца разводзіць.

Не, Туся, абломішся: рэвалюцыя на падыходзе.

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

Выданні для агляду прадстаўленыя кніжнай крамай «Акадэмічная кніга», Мінск, пр-т Незалежнасці, 72.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	9.06	16.51	7.45
Віцебск —	9.03	16.34	7.31
Магілёў —	8.57	16.41	7.44
Гомель —	8.45	16.46	8.01
Гродна —	9.20	17.08	7.48
Брэст —	9.13	17.16	8.03

Месяц

Апошняя квадра 27 лістапада.
Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Імяніны

Пр. *Аляксандра, Валянціна, Дзмітрыя, Івана, Міхаіла, Сяргея.*
К. *Альбіны, Паўліны, Пятра, Рафала, Яна.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

2 СНЕЖНЯ

У краіне

1857 год — з'явіўся рэскрыпт Аляксандра II на імя віленскага генерал-губернатара У. І. Назімава аб стварэнні ў заходніх губернях губернскіх камітэтаў па сялянскіх пытаннях; пачатак падрыхтоўкі сялянскай рэформы і адмены прыгоннага права.

1902 год — нарадзіўся Анатоль Вольны (Анатоль Іўсцінавіч Ажгірэй), беларускі пісьменнік, заслужаны дзеяч мастацтваў БССР. Адзін з заснавальнікаў літаратурнай арганізацыі «Маладняк*». Аўтар прыгодніцкай аповесці «Два», аповесці «Антон Савіцкі», кнігі фельетонаў «Суседзі». Па сцэнарыях А. Вольнага пастаўлены фільмы «Новая радзіма», «Сонечны паход» і іншыя.

1917 год — у Магілёве ліквідавана Стаўка Вярхоўнага Галоўнакамандуючага; 2 снежня Магілёўскі ваенна-рэвалюцыйны камітэт узяў Стаўку пад свой кантроль. На наступны дзень Стаўку занялі рэвалюцыйныя войскі на чале з прапаршчыкам М. В. Крыленкам, які быў прызначаны Галоўнакамандуючым Стаўкі замест забітага салдатамі генерала М. М. Духоніна.

1935 год — нарадзіўся Аляксандр Міхайлавіч Салагуб, беларускі вучоны ў галіне машынабудавання, доктар тэхнічных навук, прафесар, заслужаны вынаходнік Беларусі. Аўтар навуковых прац па канструяванні колавых і гусянічных машын з тэхналагічнымі комплексамі для механізацыі будаўнічых і дарожных работ, тэхналогіі, эканоміцы і арганізацыі машынабудавання.

У свеце

1804 год — Напалеон I Банапарт абвясціў сябе імператарам Францыі.

1805 год — паражэнне рускіх і аўстрыйскіх войскаў у Аўстэрліцкай бітве ад арміі Напалеона.

1837 год — нарадзіўся Джозэф Бэл, брытанскі хірург, прафесар Эдынбургскага ўніверсітэта, які стаў прататыпам Шэрлака Холмса.

1897 год — нарадзіўся Іван Хрыстафоравіч Баграмян, Маршал Савецкага Саюза, двойчы Герой Савецкага Саюза. У гады Вялікай Айчыннай вайны камандаваў войскамі 1-га Прыбалтыйскага і 3-га Беларускага франтоў. У 1958—1968 гадах — намеснік міністра абароны — начальнік тылу Узброеных Сіл СССР.

1927 год — у Маскве пачаўся XV з'езд УКП(б), які адобрыў дырэктывы па першым пяцігадовым плане і курс на калектывізацыю сельскай гаспадаркі.



1942 год — ва ўніверсітэце Чыкага (ЗША) італьянскі фізік Энрыка Фермі з паплечнікамі ўпершыню прадэманстраваў кіруемую ланцуговую рэакцыю дзялення ядраў урану.

Так гаварыў...

СЯРГЕЙ ДАЎЛАТАЎ:

«Адзіная сумленная дарога — гэта шлях памылак, расчараванняў і надзей».

УСМІХНЕМСЯ

Мерчэндайзер на сямейнай фатаграфіі ў першы рад ставіць самых прыгожых дзяцей.

Муж:
— Дзе палюбоўнік?!!!
Жонка:
— А я адкуль ведаю? Твой палюбоўнік — ты і шукай!

Перапіска ў сацыяльнай сетцы:
— А які ў цябе целасклад?
Спартыўны.
— А якім спортам займаешся?
— Сумо.

Няўдачнік прыходзіць да псіхатэрапеўта:
— Доктар, справа кранулася!
Сёння я выпусціў бутэрброд, і ён упаў маслам уверх!
Доктар бярэ з рук пацыента бутэрброд, доўга яго вывучае і кажа:
— Ды не, баценька, проста вы яго не з таго боку намазалі.

Жонка кажа мужу.
— Дарагі, так хочацца чагосьці светлага і прыемнага.
Муж:
— Піва будзеш?

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс);
аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы
тэл./факс: 311 17 27,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 3212. Нумар падпісаны ў 19.30 1 снежня 2021 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12